**1.** Раскажыце, чаму полацкага князя Усяслава празвалі Чарадзеем.
**2.** Чым адметнае княжанне Усяслава Чарадзея?
**3.** Успомніце гістарычную падзею, якая звязана з ракой Нямігай.
**4.** Ці можна лічыць Сафійскі сабор у Полацку сімвалам (знакам) самастойнага Полацкага княства? Свой адказ патлумачце.

Карыстаючыся малюнкам на с. 44 вучэбнага дапаможніка, зрабіце апісанне сабора Святой Сафіі ў Полацку. Словы для выкарыстання: *велічны, купалы, крыжы, светлы колер, цэгла, байніцы*.

## 12. ЕФРАСІННЯ ПОЛАЦКАЯ

Велічны звон склікае палачан на сход на плошчу каля Сафійскага сабора. Сюды спяшаюцца дарослыя мужчыны, гатовыя стаць пад княжацкія сцягі і бараніць сваю зямлю ад ворагаў. Князь пазірае на людскі натоўп, думае думу. Час выступаць у паход.

Па вузенькіх вулачках горада спяшаецца дзяўчынка. Гэта **Прадслава**. Ідзе хутка і ўпэўнена — горад ёй добра знаёмы. Праз хвіліну дзяўчынка ўжо каля сабора. Тут лечаць пара-


Правообладатель Издательский центр БГУ




Ефрасіння Полацкая

неных воінаў. З раніцы да вечара дапамагае Прадслава. Каму вады паднясе, каму слова ласкавае скажа...

Мінулі гады. Падрасла прыгажуня Прадслава. Ёй споўнілася 12 гадоў. У такім узросце яна ўжо лічылася нявестай. І бацька надумаў аддаць яе замуж. Але яна вырашыла інакш — сышла ў манастыр, каб прысвяціць сваё жыццё Богу і бедным людзям. Маладая манахіня атрымала новае імя — **Ефрасіння**. Яна стала жыць у Сафійскім саборы. Там чытала і перапісвала кніжкі, іх прадавалі, а грошы раздавалі бедным. Манастыры сваім набыткам дзяліліся з беднымі людзьмі, давалі прытулак падарожным.

Правообладатель Издательский центр БГУ 

У час, калі жыла Ефрасіння, дзеці атрымлівалі адукацыю дома або ў школах пры манастырах, цэрквах. Ефрасіння вучыла дзяўчынак чытаць і пісаць, рабіць розныя хатнія справы: шыць, гатаваць ежу, вышываць.

Слава аб дабрадзейнасці Ефрасінні разышлася далёка за межы Полацка. Ведалі яе і ў Кіеве, і ў Ноўгарадзе. Людзі дзякавалі за дабро, якое яна рабіла для іх. Ефрасіння вучыла людзей паважаць адно аднаго, заклікала спыніць крывавыя войны. Зброя, казала яна, прыносіць у хаты замест хлеба горыч ды слёзы.

Пражыла Ефрасіння больш за шэсцьдзясят гадоў. Добрая памяць аб ёй засталася жыць. Яна стала першай жанчынай сярод усходніх славян, якую царква абвясціла святой.

У Полацку, недалёка ад ракі Палаты́, па сённяшні дзень стаіць прыгожая, нібыта лялечная, царква. Яе пабудавалі па жаданні князёўны-манашкі, і вельмі хутка — за 30 тыдняў. Гэту царкву людзі завуць Спаса-Ефрасіннеўскай. Сцены ўнутры царквы пакрыты дзівоснымі малюнкамі, якія захаваліся да нашых дзён. Царква пабудавана так, што быццам бы імкнецца ў неба. Яна нагадвае белую птушачку, якая нібыта адпачывае на зялёным лузе.

Разгледзьце карту «Гістарычныя архітэктурныя помнікі Беларусі» на с. 8—9 атласа. Пакажыце


Правообладатель Издательский центр БГУ

на ёй Спаса-Ефрасіннеўскую царкву і горад, дзе яна была пабудавана.

У кожнага народа ёсць святыні, якімі мацней за жыццё даражылі мудрыя продкі. Для беларускага народа такой святыняй з'яўляецца Крыж Ефрасінні Полацкай. Паданне сведчыць, што крыж свяціўся, хворым вяртаў здароўе, знясіленым — надзею на лепшае жыццё. Атрымалася так, што крыж знік. І дагэтуль дакладна невядома, дзе ён знаходзіцца. Сучасны майстар аднавіў вобраз святога крыжа. Гэта святыня была ўрачыста пакладзена ў Спаса-Ефрасіннеўскай царкве. Тут захоўваюцца сёння і мошчы (астанкі) святой Ефрасінні. А пошукі сапраўднага крыжа працягваюцца.

A Разгледзьце карту «Славутыя людзі зямлі беларускай» на с. 14—15 атласа. Пакажыце на ёй сучасны помнік Ефрасінні Полацкай і горад, дзе гэты помнік узведзены.

## Карысна ведаць

Аснова Крыжа Ефрасінні Полацкай зроблена з кіпарысавага дрэва. Вышыня крыжа складае каля 50 сантыметраў. Да драўлянай асновы былі прымацаваны залатыя пласціны з вобразамі святых, каштоўныя камяні. У спецыяльных паглыбленнях знаходзяцца хрысціянскія каштоўнасці. Гэта кроплі крыві Ісуса Хрыста,

Правообладатель Издательский центр БГУ



кавалачак ад драўлянага крыжа, на якім яго распялі. Па баках крыж упрыгожаны пазалочанымі срэбнымі пласцінамі.

Крыж Ефрасінні Полацкай

**1.** Патлумачце, у чым заключаўся жыццёвы выбар 12-гадовай прыгажуні Прадславы.
**2.** Што рабілі з кніжкамі, якія Ефрасіння Полацкая перапісвала ў Сафійскім саборы?
**3.** Чаму Ефрасіння Полацкая вучыла людзей і да чаго заклікала?
**4.** Чаму Крыж Ефрасінні Полацкай з’яўляецца святыняй для беларускага народа?

**1.** Складзіце план апавядання пра жыццё Ефрасінні Полацкай.
**2.** Вызначце, якія дэталі малюнка «Ефрасіння Полацкая» на с. 47 вучэбнага дапаможніка сведчаць аб тым, што яна манахіня.
**3.** Зрабіце апісанне Крыжа Ефрасінні Полацкай. Выкарыстайце малюнак уверсе і тэкст апавядання.


Правообладатель Издательский центр БГУ

**4.** Апішыце паводле малюнка на с. 47 вучэбнага дапаможніка Спаса-Ефрасіннеўскую царкву. Словы для выкарыстання: *прыгожая, нібыта лялечная, белакаменная, аднакупальная*.

## 13. У ШТО ВЕРЫЛІ НАШЫ ПРОДКІ

Вельмі даўно нашы продкі верылі ў розныя таямнічыя сілы, у існаванне добрых і злых духаў. Сярод такіх духаў былі лесуны, хатнікі, вадзянікі. Пакланяліся Дажбогу — богу Сонца. Вельмі стараліся ўлагодзіць Перуна — бога грому і маланкі. Асаблівае значэнне надавалі Вялесу — богу жывёлагадоўлі, гандлю, багацця.

Ад старадаўніх вераванняў у нас захавалася **Купалле**. Гэта старажытнае народнае свята зараз адзначаецца летняй ноччу з 6 на 7 ліпеня. Адзін з самых вядомых купальскіх звычаяў — пошук папараць-кветкі. Згодна з паданнем, убачыць яе можна было толькі цёмнай ноччу. Трэба было запаліць свечку ў лясным гушчары, дзе шмат папараці. Лічылася, што той, хто знойдзе папараць-кветку, зможа бачыць скарбы, схаваныя пад зямлёй, разумець мову птушак і звяроў. А яшчэ ніводная купальская ноч не абыходзілася без вогнішча. Вакол яго вадзілі

Правообладатель Издательский центр БГУ